# МЕТОДЫКІ ПАРТЫСЫПАЦЫІ (УДЗЕЛЬНІЦТВА) Ў ШКОЛЕ

**Веды - крытыка - стаўленне - удзел.**

Грамадзянская адукацыя спрыяе індывідуальнаму развіццю вучняў і адначасова развіццю супольнасцей, да якіх яны належаць. Яе мэтай з'яўляецца развіццё кампетэнтных маладых людзей, іх станаўленне актыўнымі грамадзянінамі, ўдзельнікамі жыцця сваёй супольнасці, заснаванай на прынцыпах дэмакратыі, свабоды і роўнасці. Такім чынам, побач з развіццём ведаў, варта звярнуць увагу на працэс фарміравання і набыцця навыкаў, каштоўнасцяў і прынцыпаў.Грамадзянскай адукацыя ў цэлым павінна складацца з чатырох асноўных аспектаў:

а) ведання палітычнай сістэмы,
б) крытычнага мыслення і аналітычных навыкаў,
в) прынцыпах і каштоўнасцях, а таксама
г) актыўнага ўдзелу ў працэсе прыняцця рашэнняў або партысыпацыі

Праведзенае ў 1999-2000 гадах Міжнароднай асацыяцыяй адукацыі (МАА) міжнароднае параўнальнае даследаванне ў галіне грамадзянскай адукацыі паказала, што польскія чатырнаццацігадовыя падлеткі маюць самы высокі сярод 28 абследаваных краін ўзровень грамадзянскіх ведаў, але ў той жа час, яны неактыўныя ў практычным праяўленні сваіх грамадзянскіх прынцыпаў. Такім чынам, грамадзянская адукацыя спынілася на пункце а).

У наступным гады дзеянні Эўразвязу на карысць развіцця грамадства былі накіраваныя на ўлічванне , а таксама на ўмацаванне далейшых аспектаў . Адным з найбольш уплывовых дакументаў , накіраваных на развіццё і роўнасць шанцаў для ўсіх грамадзян і закліку да актыўнага ўдзелу ў жыцці грамадства з'яўляецца *Рэкамендацыя Эўрапейскага Парламенту і Рады Эўразвязу ў справе ключавых кампетэнцый для бесперапыннага працэсу навучання цягам ўсяго жыцця* ад 2006 году. Уваходзячыя ў склад кампэтэнцыі можна акрэсліць як камбінацыі ведаў , уменняў і навыкаў, якія адпавядаюць сітуацыі. Ключавыя кампетэнцыі былі вызначаныя як тыя , якія ўсе людзі патрабуюць для самарэалізацыі і самаразвіцця , актыўнай грамадзянскай пазіцыі , сацыяльнай інтэграцыі і працаўладкавання . Выдзяляюць восем істотных кампетэнцый: зносіны на роднай мове і на замежных мовах , матэматычныя кампетэнцыіі , інфарматычныя , кампетэнцыі навукі і тэхнікі , сацыяльныя і грамадзянскія кампетэнцыі, ініцыятыўнасць і прадпрымальніцтва , свядомасць і экспрэсія культурнага самавызначэння.



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

**Методыкі ўдзелу ў школе**

Школа рэалізуе грамадзянскую адукацыю ў двух напрамках - шляхам прадстаўлення маладым людзям ведаў на тэмы, звязаныя з ёй, і адначасова з'яўляецца трэнерам першых спробаў актыўнага ўдзельніцтва ў грамадскім жыцці. Пад лозунгам "Дзейнічай лакальна, думай глабальна" ("Globally connected, locally engaged ") праграмы Active Citizens (Актыўная Супольнасць, Брытанскі савет), накіраванай на актывізацыю лакальных супольнасцей, падтрымку грамадзянскай пазіцыі, навучанне мясцовых лідэраў і на прадухіленне сацыяльнай ізаляцыі школы, што з'яўляецца першай лакальнай супольнасцю і ў той жа час ўстановай, з якой сутыкаецца моладзь.
Фармулюе меркаванне аб тым, чым з'яўляюцца дзяржаўныя ўстановы, і якую ролю выконваюць грамадзяне у іх. Такім чынам, на школе палягае адказнасць прызвычайвання маладых людзей да таго, што інстытуцыйныя структуры і ўлады з'яўляюцца празрыстымі, інфармацыі даступнымі, і ўся супольнасць мае права ўдзельнічаць у працэсах прыняцця рашэнняў. Механізмы і інструменты могуць быць выкарыстаны як для вырашэння сацыяльных праблем дзяцей, так і дзеля прадухілення сацыяльнай ізаляцыі і дыскрымінацыі ў групе аднагодкаў. Дазваляюць развіваць навыкі актыўнага ўдзелу ў грамадскім жыцці, ламаюць існуючыя формы зносін з пазіцыі ўлады, пераглядаюць адносіны паміж дзіцем і дарослым. Спрыяюць назапашванню сацыяльнага капіталу і павелічэнню грамадзянскай актыўнасці будучых пакаленняў[1].

**Парады для настаўнікаў**

**1) Ад малога да вялікага сацыяльнага ўзаемадзеяння**

Удзел у грамадскім жыцці пачынаецца з індывідуальнай актыўнасці грамадзян у справах, якія іх датычацца, з ініцыятывы дробных суполак і арганізацый, а сканчваецца заангажаваннем усіх зацікаўленых бакоў, уключаючы мясцовыя органы ўлады і бізнес. Такую мадэль ўдзелу можна перанесці ў школы, пачынаючы працу ад актывізацыі адзінак з дапамогай пошуку і ацэнкі іх рэсурсаў і патрэбаў, з дапамогай адчынення і будавання свядомасці, а таксама дзякуючы працы ў вялікіх групах, а на прыканцы з дапамогай форуму ўсёй школы або ўдзелу ў іншых суполках. Такі падыход можна ахарактарызаваць як пераход ад малога да вялікага сацыяльнага ўзаемадзеяння. Яго мэтай з'яўляецца забяспечванне пачуцця бяспекі, даверу і эфектыўнасці, што расцягваецца кожны раз на большыя сацыяльныя групы. У сцэнарах навучання адлюстроўваецца ў пераход ад індывідуальнай працы, працы ў парах і працы ў групах падчас форуму.

[1] Por. M. Brzozowska-Brywczyńska..., s.5 – 8.



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

**2) Падыход,сканцэнтраваны на вырашэннях.**

Удзел сканцэнтраваны на пераходзе ад прыняцця рашэння да дзейнасці. Згодна з прыкладам, найбольш цэніцца зацікаўленасць (Appreciative Inquiry), якая апіраеца на каштоўнасці і пошуку рашэнняў, а не на недахопах і праблемах. Гэты падыход таксама аптымальны ў працы з дзецьмі, а менавіта з асобамі з малым пачуццём уласнай каштоўнасці, тыповым для часу сталення.

**Падыход, сканцэнтраваны на прабелеме:**

1. **Ідэнтыфікацыя праблемы**
2. **Аналіз праблемы**
3. **Аналіз патэнцыяльных вырашэнняў**
4. **Карэктыруючая дзейнасць**

**Падыход, сканцэнтраваны на вырашэннях:**

1. **Дацэньванне таго "што ўжо з'яўляецца" найлепшым**
2. **Стваранне візіі таго "што можа быць"**
3. **Дыялог аб тым, "што павінна быць"**
4. **Стварэнне таго "што будзе"**

**Апрацаванне E.M. Okroy, E.S. Okroy (Appreciative Inquire)**

**3) Адукацыя з дапамогай досведу.**

Шляхам заангажавання моладзі з'яўляецца дзейнасць, апартая на досведзе. Гэта дазваляе не толькі зінтэнсіфікаваць працэс навучання, але таксама і ўзмацніць сацыяльны характар заняткаў. Мы можам вылучыць пяць этапаў у рэалізацыі вучэбных задач:

- Этап першы- досвед- апарты на дзейнасці, выкананні чагосці.

-Этап другі- справаздача-дзяленне рэфлексіямі і ідэямі на тэму таго, што здарылася.

-Этап трэці-рэфлексія- абмяркоўванне кожнага элементу і дынамікі сытуацыі, каб лепей зразумець сам досвед.

-Этап чацвёрты-абагульненне- абмяркоўванне кожнага элементу і рабленне вынікаў таго, чаму мы навучыліся, што адносіцца да "праўдзівага свету".

-Этап 5 – стасаванне- выкарыстанне таго, чаму мы навучыліся, змена нашых цяперашніх паводзінаў [2].

**4) Атмасфера**

Грамадзянская адукацыя ў значнай ступені апіраецца на абмен вопытам, ведамі і разважаннямі удзельнікаў, на выражэнне сваіх меркаванняў, на пошук рашэнняў. Таму істотна, каб усе мы адчувалі сябе ў бяспецы і мелі свабоду слова і дзеяння. На атмасферу ўплывае пастава кіруючых асобаў, арганізацыя месца, дзе праводзяцца

[2] Por. *Kompas. Edukacja o prawach człowieka w pracy z młodzieżą,* Głogów, 2004, s.43.

заняткі, доступ да матэрыялаў, мова, якой ўдзельнікі паслугоўваюцца (зразумелая, сяброўская), празрыстасць правілаў (лепш за ўсё, каб яны былі створаныя разам). У выпадку працы з людзьмі з абмежаванымі магчымасцямі , мы павінны ўлічваць іх патрэбы.

**5) Розныя стылі навучання**

Практыкаванні павінны ўлічваць розныя стылі навучання , а таксама і патрэбы вучняў. Наогул можна выдзеліць: візуальныя, слыхавыя і кінестатычныя мадэлі навучання. Гэта азначае, што асоба, якая аддае перавагу візуальнай мадэлі, жадае прымаць удзел і адначасова аблегчыць сваё навучанне з дапамогай практыкаванняў, апартых на малюнках, чалавек са слыхавым стылем – запамінае тое, што ён чуе, з кінестэтычным – навучанню дапамагае эмацыйны і тактыльны досвед.

**6)Крэатыўныя пытанні**

Наступным карысным інструментам з'яўляецца пераход ад пытанняў ацэнкі (Хто вінаваты?, што ты зрабіў/зрабіла не так ?, што ты згубіў/згубіла?, Што не працуе?, і таксама: Хто заслужыў прыз ?...) да крэатыўных пытанняў (што здарылася?, што я хачу дасягнуць?, што я магу даведацца, што працуе? што маё ўплыў, і што я магу змяніць? ...).

**7) Камунікат „я".**

Звярні ўвагу на тое, каб асобы, якія выказваюцца на тэму досведу, рэфлексіі, казалі ад свайго імя "я думаю, адчувала, адчуваў", а не рабілі абагульненняў як "усе, мы".

**8) Роля асобы, якая праводзіць заняткі.**

Таксама на ролю настаўніка ўплывае заангажаванне вучняў. У працэсах партысыпатыйных яна часта зводзіцца да фасілітацыі (аблягчэння). Настаўнік і прапаноўвае, і праводзіць практыкаванні, клапоціцца аб атмасферы роўнасці і аб абагульненні мэтаў, суправаджае адкрыццё і ўзаемаабмен досведам і ведамі, паказвае вучням, што не з'яўляецца адзіным экспертам у перадачы сваіх ведаў,досведу і загадзя устаноўленых прынцыпаў або таксама экспертам у вырашэнні праблемы. Акрамя таго, дысцыпліна не з'яўляецца вынікам волі настаўнікі, а вынікам дамоўленасці групы. Асоба, якая праводзіць заняткі, характарызуецца верай у тое, што людзі хочуць вучыцца, з'яўляюцца самастойнымі ў пошуках, крэатыўнымі і адказнымі[3]. Маючы на ўвазе такія прынцыпы, настаўнік захоўвае эластычнасць у планаванні таго, як будуць праходзіць заняткі, вядзе перамовы наконт змены плану, маючы на ўвазе патрэбы і мэты групы.

3 Por. *Kompas. Edukacja o prawach człowieka w pracy z młodzieżą,* Głogów, 2004, s.46.

**8) Узаемнае выкананне практыкаванняў**

Групавая праца кіруючых асобаў (2 або больш чалавек) дапамагае абмяркаванню праграмы ў парах/ групах на стадыі праектавання і ацэнкі. Перш за ўсё, гэта паніжае дамінаванне кіруючых асобаў. Таксама гэта ўплывае на сам працэс правядзення заняткаў. Каманда можа роўным чынам падзяліцца адказнасцю, заданнямі падчас выканання працы ў падгрупах або засяродзіць увагу на індывідуальных патрэбах вучняў. Падчас практыкаванняў, асабліва ў сітуацыях групавога супрацыву, група можа падтрымліваць адзін аднаго і выразіць назапашаныя эмоцыі. Каманда можа складацца з асобаў з падобнымі або рознымі кампетэнцыямі, аднак у ёй заўсёды павінна панаваць атмасфера даверу. У яе склад могуць уваходзіць валанцёры і практыканты.

**9) Правядзенне практыкаванняў**

Адной з умоваў адукацыйнага працэсу з'яўляецца шлях правядзення заняткаў. Трэба мець на ўвазе наступныя аспекты:

**a) Час**

Тайм-менеджмент з'яўляецца важнай часткай планавання і правядзення заняткаў. Заўсёды тэрба клапаціцца пра тое, каб знайсці час на дыскусію і на сканчванне практыкаванняў. Калі, у сваю чаргу, застаецца трохі вольнага часу, не варта штучна працягваць практыкаванне.

**b) Інстукцыі**

Інстукцыі павінны падавацца ясна і адназначна. Заўсёды трэба ўпэўніцца, ці ўсе вучні разумеюць заданне і ўсе завартыя ў ім паняцці (калі яны завартыя ў іструкцыі), ці не маюць ніякіх сумневаў. Заахвочвай да задавання пытанняў. Інструкцыі можна запісаць на дошцы, фліпчаце або раздаць на выдрукаваных аркушах пареры. Калі запланавана праца ў групах, то трэба падаць інструкцыю перад падзяленнем на групы.

**c) Дыскусія**

Дыскусія дапамагае запрэзентаванню і абмену ўласнымі меркаваннямі. Задбай, каб кожны вучань прымаў актыўны ўдзел у дыскусіі, старайся заангажаваць як мага большую колькасць асобаў. Памятай пра захаванне раўнавагі паміж глабальнымі і лакальнымі аспектамі і таксама аб тым, каб яны былі безпасярэдне звязаныя з жыццём вучняў. Тэма павінна быць прадстаўлена нейтральным шляхам.

**d) Абмяркоўванне і ацэнка практыкавання**

Кожнае практыкаванне або цыкл практыкаванняў павінен сканчвацца самарэфлексіяй на тэму працэсу здабычы ведаў пра самога сябе і пра навакольны свет. Аўтарэфлексія з'яўляецца інструментам, які дазваляе вучыцца з уласнага досведу. Абмяркоўванне і ацэньванне складаецца з некалькіх тыпаў пытанняў, зададзеных у наступнай чарзе: што

адбылося падчас выканання практыкавання, і якія адчуванні, эмоцыі суправаджалі практыкаванне; што вучні даведаліся пра сябе, дзякуючы практыкаванню; што даведаліся аб правілах, якія паўсталі ў практыкаванні; якім чынам яны могуць прымяніць набытыя веды і досвед на практыцы.

**e) Абагульненне**

Істотным з'яўляецца тое, каб кожны занятак, модуль або цыкл скончыць абагульненнем. Яно аб'ядноўвае як і мэрытарычны змест, так і сам працэс навучання. Можа прымаць розныя формы: дыскусіі, пастаноўкі, пластычнай працы і так далей. Дазваляе ўпарадкаваць і захаваць акрэслены абшар працы.

**10) Матывацыя**

Удзел не мог бы існаваць, калі б удзельнікі не былі б заангажаваныя ў дзейнасць ад пачатку да канца, ад прыняцця рашэння да святкавання ўдалага праекту. Працэсы удзелу як правіла трываюць даўжэй чым аўтарытарна прынятыя рашэнні і ў той жа час прыносяць больш доўгатэрміновыя вынікі.

Традыцыйна, адрозніваюць 2 тыпы матывацыі: знешняя і ўнутраная. Знешняя матывацыя накіраваная на дасягненнне знешняй мэты, якая не заўсёды адпавядае выкананай дзейнасці. Прыкладамі такой матывацыі могуць быць розныя конкурсы з узнагародамі, візіт да стаматолага, каб паменьшыць зубны боль. Унутраная матывацыя вынікае з самога заахвочвання дзейнасцю, істотным тут з'яўляецца высілак і наступныя этапы дасягнення мэты. Тэорыя пазнаўчага дысанансу паказвае на тое, што калі дзейнасць матываваная знутры і адначасова моцна ўзнагароджваецца, то матывацыя змяняецца на знешнюю, і дадзеная асоба страчвае прыемнасць ад сваёй дзейнасці, нават калі яна яе раней вельмі любіла. Грамадская адукацыя ўзмацняе ўнутраную матывацыю. Дзейнасць, якая апіраецца на ёй, характарызуецца доўгатэрміновасцю, супрацай і накіраванасцю на дасягненне супольнага дабрабыту. Унутраная матывацыя абараняе ад пачуцця правалу ў выпадку недасягнення пастаўленай мэты.

Мадэль, якая сканцэнтравана на развіцці ўнутранай матывацыі, з'яўляецца мадэллю працы з лакальнай супольнасцю (школа, напрыклад), выпрацаванай у межах раней узгаданай праграмы *Active Citizens*. Праграма апіраецца на ўзмацненне індывідуальных і сацыяльных каштоўнасцей, знаходжванні патрэбаў і таксама на перакязванні адказнасці ўдзельнікам групы. Гэта выражаецца ў так званым падыходзе, які ацэньвае зацікаўленасць (Appreciative Inquiry) і пунктам выйсця якога з'яўляецца не канцэнтрацыя на праблеме, а на яе вырашэнні. Карыстаючыся гэтай методыкай, можна ўзмацніць пачуццё вартасці і спраўнасці, а таксама і прыналежнасці кожнай асобы да

грыпы, і ў сувязі з гэтым, акцэнт пошуку знешняга самасцвяржэння пераносіцца на ўласнае развіццё.

Адным з інструментаў, якія ўзмацняюць унутраную матывацыю, з'яўляецца дасягненне мэтаў. Да задач настаўніка належыць мадэляванне групы такім чынам, каб магчымая мэта была зрэалізавана. Адным са шляхоў вызначэння мэтаў з'яўляецца методыка S.M.A.R.T. Скарачэнне з'яўляецца акронімам ангельскіх словаў і адносіцца да шляхоў фармуліроўкі мэтаў:

| | |
|---|---|
| **S**imple- просты або **S**pecific (акрэсленая) | Фармуліроўка мэты такім чынам, каб яе немагчыма было свабодна інтэрпрэтаваць; адказвае на пытанні: Чаго я хачу дасягнуць? Каго гэта датычыцца? |
| **M**easurable (мерная) | Акрэслівае мэту, якая запэўнівае мернасць яе дасягнення, найлепш у форме лічбаў; адказвае на пытанні: Калі і што дакладна я хачу дасягнуць? Як магу гэта вымяраць? |
| **A**chievable (дасягальная) | Мэта мусіць быць дасягальнай, рэалістычнай; занадта амбітная мэта падрывае веру ў яе дасягненне і тым самым матывацыю да яе рэалізацыі; адказване на пытанні: Якія мае каштоўнасці і этапы дзеяння? |
| **R**elevant (істотная) | Вызначае, якім менавіта павінен быць істотны крок наперад; адказвае на пытанне: Якую каштоўнасць яны для мяне маюць? |
| **T**imely defined (вызначаная ў часе) | Дакладны час на рэалізацыю. Пытанне: Калі мы хочам яе дасягнуць? |
| + **E**xciting (захапляльны) | Апартая на пазітыўных эмоцыях; Якія эмоцыі прабуджаюцца? |
| + **R**ecorded (запісаны) | Магчымасць запісання; Як яе запісаць? |

Апрацаванне: E.M. Okroy, E.S.Okroy



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

**Выбраныя методыкі і практыкаванні, апартыя на тэхніках партысыпацыі (удзелу)**

**СТАНЦЫІ**

Цыкл заданняў у форме станцый дае магчымачць прадстаўлення і ўзаемапазнання групы з захаваннем пачуцця бяспекі вучняў/ўдзельнікаў заняткаў. Дае кіраўніку парады, якія датычацца правядзення заняткаў і магчымасці далейшага манітаравання працэсу навучання, і таксама надае адказнасць за гэты працэс ўдзельнікам.

**Час 30-45 хвілін**

**Мэты**

- Аўтарэфлексія вучняў/ўдзельнікаў аб сваім удзеле ў зянятках.
- Узаемнае пазнаванне ўдзельнікаў.
- Дастасаванне заняткаў да патрэбаў ўдзельнікаў з дапамогай пазнавання кіраўніком ступені досведу ў дадзеных абшарах, чаканнях і страхах удзельнікаў.
- Манітараванне ходу заняткаў.
- Узаемаадказнасць за ход заняткаў

**Матэрыялы**

Кавалак фліпчарту/дошкі, маркеры, крэйда, прывітальны планшэт, карткі з інфармацыяй аб станцыях, карткі для візітовак, планшэт чаканняў і страхаў, стыкеры, пісьмовыя прыналежнасці.

**Падрыхтоўка:**

- Падрыхтуй прывітальны планшэт, напрыклад, : “Сардэчна вітаю на занятках (тэма)! Запрашаю на шпацыр па 3 станцыях і да самастойнай рэалізацыі заданняў”. Пастаў або павесь на бачным месцы.
- Падрыхтуй 3 аддаленыя ад сябе станцыі:

**Станцыя досведу**

- Намалюй на фліпчарце/дошцы некалькі ліній. Кожная лінія павінна датычыцца іншага абшару досведу, які адпавядае тэме заняткаў і запланаванаму способу іх правядзення, напрыклад, працы ў групе, выказванню падчас дыскусіі, рабленню калажоў, валантэрству, сацыяльнай журналістыцы, экалогіі. Падпішы кожную лінію, каб ўдзельнікі ведалі, што яна азначае.
- Злева напішы “вялікі досвед”, справа “малы досвед”. Такім чынам атрымліваецца шкала. Пакладзі маркеры/крэйду, якімі ўдзельнікі будуць зазначаць на шкале свой узровень досведу.
- Змясці назву станцыі паблізу і інструкцыю: “Станцыя досведу. Падумай аб сваім досведзе і навыках у акрэсленым абшары на гэтай лініі. Зазнач тыя месцы на лініі, якія,



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

на тваё меркаванне, адпавядаюць твайму досведу.”

**Станцыя чаканняў і страхаў**

- Падрыхтуй вялікі аркуш паперы. Падзялі планшэт перакрыжаванымі лініямі на 4 роўныя часткі. Наверсе напішы назву станцыі, а злева напішы “чаканні”, справа “страхі”, а пасярэдзіне напішы інструкцыю: “Напішы на картках свае чаканні і страхі і павесь на ніжняй частцы планшэту- па левым баку чаканні, а па правым страхі. На кожнай картцы змясці толькі адно з чаканняў або адзін са страхаў. Можаш павесіць столькі картак, колькі захочаш.”
- Пакладзі побач стыкеры з пісьмовымі прыналежнасцямі.

**Станцыя візітовак**

- Змясці ў дастаткова вялікай прасторы інструкцыю: “Станцыя візітовак. Выбяры любую картку паперы. Напішы на ёй сваё імя і прозвішча або мянушку, якой цябе называюць іншыя асобы, або тое, як ты хочаш, каб да цябе звярталіся”. Частку карткі, якая засталася вольнай, падзялі на 4 часткі. У верхняй правай частцы напішы, чым ты хочаш падзяліцца, што можаш зрабіць або што можа быць прыдатным падчас сённяшніх занядкаў, а ў левай верхняй частцы напішы тое, дзе ты хочаш актыўна ўдзельнічаць. Потым пазнаёмся з візітоўкамі іншых асобаў. Дапішы сваё імя ўнізе тых картак, калі ты б хацеў скарыстацца навыкамі, ведамі сябра/сяброўкі або можаш прапанаваць ім сваю дапамогу.
- Падрыхтуй і павесь сваю візітоўку.
- Пакладзі рознакаляровыя паперкі фармату А4 і пісьмовыя прыналежнасці.

**Мадыфікацыя**

- Пры візітоўках можна не ўпісваць імя і прозвішча, а захаваць поле толькі для навыкаў і патрэбаў. Такім чынам можна сабраць каштоўнасці групы, захоўваючы ананімнасць кожнай асобы. Падрыхтуй месцы, якія ўдзельнікі на прыканцы заняткаў маглі б заняць.
- Можаш таксама падрыхтаваць столік з напоямі, пачастункам, якім могуць пачаставацца ўдзельнікі.

**Ход заняткаў**

- Падчас выхаду з залі ўдзельнікі самастойна рэалізоўваюць заданні, а па сканчэнні займаюць падрыхтаваныя месцы.
- Асоба, якая праводзіць заняткі, парушаецца сярод удзельнікаў, спраўджвае ці ўсе заданні яны разумеюць, знаёміцца з вынікамі працы ўдзельнікаў. Калі яна заўважае, ўто ўсе выканалі заданне, то тады запрашае да займання месцаў. Вітае ўдзельнікаў і дзякуе ім за прадстаўленне сябе і за падзел сваім досведам, чаканнямі і страхамі.

**Абмяркоўванне і ацэньванне**

- Задай наступнае пытанне: Як вы сябе адчувалі падчас першай часткі спаткання/ падчас яго рэалізацыі/ падчас наступных станцый? І што з’яўлялася найбольш цяжкім для вас, што найбольш лёгкім, што было для вас сюрпрызам? Робячы абагульненне паінфармуй, што станцыі будуць дапамагаць ходу цэлых заняткаў. Будуць служыць

манітараванню і ўзмацненню працы. Вучні/удзельнікі могуць дапісваць уласныя візітоўкі цэлы час, а таксама візітоўкі іншых асобаў. Калі хтосьці думае, што нейкае чаканне або страх зрэалізаваў сябе, то трэба павесіць іх на верхнюю частку планшэту.

**Парады для асобаў, якія праводзяць занятк**і

- Станцыі выкарыстоўваюцца падчас працы з групай, удзельнікі якой ведаюць адзін аднаго.
- Эфекты працы павіны адпавядаць далейшаму працэсу навучання. Калі мы размаўляем пра цыкл- то цэламу цыклу навучання.
- Вучні/удзельнікі могуць наведваць станцыі і рэалізаваць заданні ў вольнай чарзе.
- Апроч выканання індывідуальнай працы, вучні/удзельнікі могуць размаўляць паміж сабой.
- Настаўнік або асоба, якая кіруе навучаннем, можа не прысутнічаць або быць невідочнай і пачакаць, калі вучні/удзельнікі самі вырашаць рэалізацыю заданняў, кіруючыся папярэднімі парадамі.
- Трэба звяртаць ўвагу, каб "патрэбы" не ўспрымаліся вучнямі як "недахопы".
- Падчас заняткаў можна выкарысоўваць адну, дзве або тры станцыі.

**КАРОТКІЯ СПАТКАННІ**

Кароткія спатканні адчыняюць воркшопы (трэнінгі) дынамічным шляхам. Дазваляюць вучням/удзельнікам пачаць дзень ад падзелу сваімі пазытыўнымі доследамі ў іншай дзейнасці. Таксама яны з'яўляюцца формай узаемапазнавання з нефармальнага боку.

**Памер групы** ад некалькіх асобаў да некалькіх тысячаў

**Час** 14-25 хвілін

**Матэрыялы**

- Свісток або сігналізацыйны званок

**Мэты**

- Увод добрай атмасферы, развіццё даверу і адчыненасці.
- Дынамічны і партысыпацыйны пачатак спаткання.
- Узаемапазнаванне вучняў/удзельнікаў заняткаў. У выпадку групы, якая ўжо знаёмая з кожным удзельнікам- змена перспектывы узаемапазнавання. Узбуджэнне узаемнай зацікаўленасці.
- Развіццё пазытыўнага пазнання саміх сябе з дапамогай іншых удзельнікаў, павелічэнне пацуцця ўласнай каштоўнасці.
- Развіццё навыка прэзентацыі сваіх думак і адчуванне іх у кароткай скандэнсаванай форме.



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

**Падрыхтоўка**

- Падрыхтуй прастору, у якой група будзе свабодна перамяшчацца. Крэслы пастаў колам.
- Заплануй тэмы размоваў/пытанні, напрыклад,: што паслужыла падставай для тваёй усмешкі ў апошнія 24 гадзіны, што цябе здзівіла на працягу апошняга тыдня, чым ты ганарышся, які самы малы падарунак ты зрабіў/зрабіла, якая твая любімая пара году і чаму? Якія твае любімыя заняткі? Памятай, каб гэтыя пытанні будзілі пазітыўныя эмоцыі.

**Ход**

- Папрасі ўсіх асобаў аб тым, каб яны падняліся са сваіх месцаў. Запрасі ўсіх на сярэдзіну залі.
- Падай інструкцыю: "Падчас практыкавання кожны у сваім асабістым тэмпе парушаецца па залі. Калі прагучыць сыгнал, то кожны падыходзіць да асобы, якой не ведае або да той, з якой доўга не кантактаваў. Акрэслены час размаўляйце адзін з адным у парах на тэму, паданую настаўнікам. Пасля сыгналу трэба скончыць размову і разысціся. Практыкаванне складаецца з некалькіх сэрый падыходаў і спатканняў."
- Па вытлумачэнні інструкыі запрасі ўдзельнікаў да перамяшчэння па залі. Кіруй часам і размовамі. Задавай наступныя пытанні вучням/удзельнікам. Паўтары 3-5 цыклы, залежна ад ўзроўню энергіі і колькасці асобаў у групе.

**Абмяркоўванне і ацэнка**

Падзякуй удзельнікам за ўдзел. Запытайся, ці здарылася нешта, аб чым яны хацелі б падзяліцца.

**Мадыфікацыя**

Можаш прапанаваць паміж спатканнямі і размовамі розныя спосабы парушання па залі, напрыклад : як у тумане, як на лёдзе, скаканне як заяц, скаканне з камня на камень.

- Пасля астатняга раунду папрасі заняць месцы. Спытайся ў ўдзельнікаў/вучняў, як ім размаўлялася, якія эмоцыі ўзбудзіла ў іх практыкаванне, што новага яны даведаліся аб сваіх партнэрах падчас размоваў і аб саміх сабе, ці практыкаванне было лёгкім для выканання, што было складаным у ім?

**Парады асобам, якія праводзяць заняткі**

- У выпадку няцотнай лічбы ўдзельнікаў, папрасі вучняў/ўдзельнікаў, каб падчас кожнага раунду яны стваралі адну 3 асабовую групу.
- У выпадку асобаў, якім цяжка парушацца, трэба мецьна ўвазе іх патрэбы. Тэмы размоваў/ задаванняў пытанняў павінны абуджваць пазітыўныя пачуцці, прыемныя думкі і ўспаміны. Павінны адносіцца да асобаў як да індывідуальнасцей, а не як да акрэсленых групаў супольнасці.



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

**ПАРКОЎКА**

Паркоўка дазваляе прытрымліваца тэмы і паніжаць пабочныя эфекты, яна аб'ядноўвае мерытарычныя прынцыпы і адносіны ў групе.

**Час** 5 хвілін (тлумачэнне), цэлыя заняткі (праца з паркоўкай)

**Мэты**

- Утрыманне канцэнтрацыі на галоўнай тэме.
- Маніторыванне ходу заняткаў.
- Звяртанне ўвагі на патрэбы ўсіх вучняў/удзельнікаў заняткаў

**Матэрыялы**

- Планшэт з надпісам "паркоўка", стыкеры, пісьмовыя прыналежнасці.

**Падрыхтоўка**

Павесь на бачным, але не на цэнтральным месцы картку з надпісам "Паркоўка". Прастору, якая прызначаная на пракоўку, падзялі лініяй на частку верхнюю і ніжнюю. Пакладзі паблізу стыкеры і пісьмовыя прыналежнасці.

**Ход**

**f)** Патлумач, як яе трэба ўжываць: зверху паркоўкі вешаем карткі з заўвагамі, пытаннямі, якія з'яўляюцца ў тракце заняткаў і звязаныя з імі, але адхіляюцца ў бок ад галоўнай ідэі. Усе вывешаныя на паркоўцы прынцыпы будуць абмеркаваныя ў далейшай частцы заняткаў. Пасля абмеркавання прынцыпаў, мы перавешваем іх на ніжнюю частку паркоўкі. Паркоўка будзе спрыяць нашым заняткам/ цыклу заняткаў. Перакажы інфармацыю на тэму абмеркавання павешаных прынцыпаў (напрыклад, пасля перапынку, напрыканцы заняткаў) і таксама на форму іх прэзентацыі на форуме.

**g)** Падчас наступнай часткі заняткаў, сачы за сытуацыяй на паркоўцы. У патрэбным моманце паразмаўляй разам з вучнямі на тэмы павешаных прынцыпаў.

**h)** Напрыканцы працы з паркоўкай запытайся: як працавалася з паркоўкай, што ўнесла ў заняткі гэта праца, ці вучні/ўдзельнікі хацелі б у будучыні нешта змяніць у форме працы з паркоўкай? Пакажы, як вучні/ўдзельнікі могуць выкарыстоўваць "паркоўку" у сваім штодзённым жыцці- дыскусіях, працы, навуцы, прыгатаванні тэкстаў.

**Парады для настаўнікаў**

- Звяртай увагу на час, каб абмеркаваць усе праблемы, павешаныя на паркоўцы.
- Прызнач пэўны час, каб абмеркаваь гэтыя праблемы, напрыклад, пасля перапынку, на пачатку наступнага спаткання.
- Калі вучню прыйдзе ў галаву нейкая праблема падчас заняткаў, якая на тваё меркаванне можа актываваць працу, то трэба запрапанаваць павісіць яе на паркоўцы.



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпламатыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

- Прымі рашэнне або абмяркуй з удзельнікамі заняткаў, хто будзе прэзентаваць павешаныя на паркоўцы праблемы на форуме. Гэта можа быць асоба, якая праводзіць заняткі, іншая акрэсленая асоба або аўтар дадзенай праблемы.
- Калі ты плануеш пазней праводзіць працу, апартую на методыцы адчыненай прасторы, то можаш перанесці праблемы, павешаныя на паркоўцы, да прапановы тэмаў "адчыненай прасторы".
- Паркоўка павінна спрыяць далейшаму працэсу навучання. Калі мы маем справу з цыклам заняткаў, то- цыклу заняткаў.
- Паркоўка павінна быць уведзеная на пачатку заняткаў або ў выпадку крызіснай сітуацыі ў якасці напраўчага інструменту.

**МАЛЮНКІ**

Метафарычная праца дазваляе небезпасярэднім шляхам выразіць свае думкі і пачуцці. Запэўнівае пачуццё бяспекі і адначасова адчыняе прастору для нешаблоннага, крэвтыўнага мыслення падчас воркшопаў.

**Памер групы** да 20 асобаў

**Час** 15-45 хвілін

**Мэты**

- Узаемапазнанне.
- Добразычлівая атмасфера.
- Пазнаванне стасункаў вучняў/удзельнікаў наконт тэмы і настрою на супрацу.
- Дыягностыка настрою і дынамікі групы і таксама кожнага вучня/ўдзельніка.
- Дапасаванне заняткаў да патрэбаў групы.
- Фарміраванне творчага мыслення.

**Матэрыялы**

- Малюнкі

**Падрыхтаванне**

- Падрыхтуй некалькі малюнкаў. Гэта могуць быць паштоўкі, выразаныя фрагменты газет, улётак. Задбай аб тым, каб яны былі рознымі, дапасаванымі да прадстаўленага зместу, памеру, колераў, патрэбаў вучняў, звяртаючы ўвагу на іх культуру, узрост, ўзровень эфектыўнасці і іншыя аспекты. Відавочна, малюнкаў павінна быць нашмат больш, чым удзельнікаў заняткаў.
- Пастаў крэслы ў кола. Пасярэдзіне пакладзі малюнкі такім чынам, каб яны ўсе былі бачныя.

**Ход**

- Папрасі вучняў/ўдзельнікаў, каб яны прыглядзеліся да раскіданых малюнкаў.
- Праз хвіліну папрасі, каб кожны выбраў і ўзяў у далонь той малюнак, які пераказвае яго актуальнае стаўленне да тэмы спаткання.



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпламатыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеянні.

- Калі ўсе ўжо выберуць малюнкі і вернуцца на свае месцы, папрасі, каб кожны прадставіў свой выбар і паклаў малюнак там, дзе ён знаходзіўся першапачаткова.

**Абмяркоўванне і ацэнка.**

- Спытайся, як удзельнікі сябе адчувалі, калі глядзелі на малюнкі, выбіралі іх і прэзентавалі свае паштоўкі, і як сябе адчувалі падчас слухання выказванняў іншых асобаў.

**Парады для настаўнікаў**

- Калі дзве або некалькі асобаў зацікавіліся тым самым малюнкам, то яны могуць па чарзе яго запрэзентаваць- кожны будзе мець сваю інтэрпрэтацыю.
- Калі ў групе прысутнічаюць асобы з дрэным зрокам, то задбай, каб малюнкі былі адпаведнага памеру (А4), характарызаваліся кантраснымі колерамі і каб у іх не прысутнічала зашмат элементаў.
- Малюнкі можна замяніць прадметамі.
- Практыкаванне не можа быць праведзена ў вельмі вялікай групе, бо ў пэўным моманце вучням/удзельнікам будзе нецікава і яны перастануць слухаць адзін аднаго.
- Можна таксама акрэсліць максымальны час на выказванне адной асобы, каб яно не было задоўгім.
- Істотным элементам з'яўляецца адкладанне малюнку, што мае сымбалічную мэту паказвання эмоцыяў, звязаных з ім.
- Гэтае практыкаванне з'яўляецца практыкаваннем, якое можа як пачынаць заняткі, так і сканчваць іх- эвалюцыйнае практыкаванне.
- Настаўнік/ кіруючая асоба можна прымаць удзел у практыкаванні.

**ВАЛІЗКА**

Вучні/удзельнікі дапаўняюць намаляваную вазізку сваім досведам, істотнымі элементамі культуры, біяграфіі, каб паглядзець на яе як на нешта, што заўсёды разам і з імі і на тое, што не з'яўляецца пераважным, а мае будаўнічую моц. Далей яны прэзентуюць яе ў форме выставы.

**Памер групы** да 30 оасобаў

**Час** залежыць ад выбранай формы напаўнення валізкі- ад 20-60 хвілін.

**Мэты**

- павелічэнне ўласнай свядомасці, таго, што ўплывае на маё захаванне,
- бачанне таго, якія мы розныя, развіццё талерантнасці,
- заахвочванне да дзялення сваім напаўторным досведам,
- дацэньванне кожнага досведу.

**Матэрыялы**

Аркушы паперы для малявання валізкі, крэйда, каляровыя часопісы, клей, нажніцы, скотч для падрыхтоўкі выставы.

**Падрыхтоўка**



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

Падрыхтуй макет валізкі, як яна выглядае, што можа мець унутры.

**Ход**

- Папрасі вучняў/ўдзельнікаў, каб намалявалі на аркушы пареры валізку, а потым напоўнілі яе з дапамогай словаў, малюнкаў, калажоў.
- Прадстаў вучням/удзельнікам мэту задання- збіранне ў валізцы значнага досведу, элементаў культуры, біяграфіі, што ўплывае на нашыя паводзіны. Зазнач, што гэта з'яўляецца індывідуальнай працай. Потым вазілкі будуць прадстаўлены на выставе, але не ўсе мусяць апавядаць аб тым, што яны намалявалі.
- Зрабі апавяданне аб нейкай прыкладнай валізцы, у якой змешчана, напрыклад, рэлігія, месца паходжання, скончаная школа, гісторыя сям'і, пол.
- Калі вучні/ўдзельнікі падрыхтуюць валізкі- папрасі, каб яны павесілі іх на сцяне.
- Запытайся, ці хтосьці хоча агульна распавесці аб тым, якія элементы ён памясціў у валізку, ці з'яўляліся яны пазітыўнымі ці негатыўнымі і на што яны ўплываюць.
- Запытайся, ці хоча хто-небудзь задаць пытанне аб якім-небудзь элементы ў валізцы, і ці аўтар хоча адказваць на пытанне.

**Абмеркаванне і ацэнка**

- Звярні ўвагу як нашыя досведы ўплываюць на спосабы паводзінаў, жыццё. Падрэслі, што кожны досвед з'яўляецца будаўнічым- без яго мы б не былі тымі, якімі з'яўляемся і не мелі б матывацыі да працы над сабой. Валізкі паказваюць таксама, якія мы розныя. Можаш уявіць айсберг (напрыклад, на падставе http://www.4pm.pl/artykuly/kultura-organizacyjna-sprzyjajaca-zarzadzaniu-projektami).)

**Парады для настаўнікаў**

- Можаш папрасіць вучняў, каб яны ўпісалі істотныя для іх элементы досведу, культуры, біяграфіі або папрасіць намаляваць і ўклеіць іх у форме калажу. Памятай, што не ўсе вучні/ўдзельнікі мусяць выказацца наконт сваёй валізкі.

**Сферы ідэнтыфікацыі**

Вучні/удзельнікі такім шляхам могуць шукаць і прыглядацца да сваёй уласнай ідэнтыфікацыі і да таго, чым з'яўляецца для іх пачуццё прыналежнасці і знаходжання ў групе.

**Памер групы** да 30 асобаў

**Час** 30 хвілін

**Мэты**

- шуканне ўласнай ідэнтыфікацыі
- пазнанне паняццяў ідэнтыфікацыі першаснай і другаснай

**Матэрыялы** карткі А4, асадкі

**Ход**

- Раздай вучням карткі паперы і асадкі.



Праект дафінансаваны Дэпартаментам Публічнай і Культурнай Дыпламатыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеянні.

- Папрасі, каб пасярэдзіне яны намалявалі кола, а ў ім напісалі сваё імся, а потым адыходзячыя ад яго прамяні, якія таксма сканчваюцца коламі.У кожным коле ўдзельнікі запісваюць назвы групаў, з якімі яны сябе ідэнтыфікуюць. Гэта можа быць футбольная каманда, рэлігійная група, група роду заняткаў. Скажы ім, што яны не будуць дзяліцца сваімі цэлымі працамі.
- Пасля таго, як яны намалююць, падзялі групу на 4-5 асабовыя падгрупы і папрасі, каб яны сказалі, чым яны кіраваліся пры выбары сваіх групаў. Ці маюць з імі мілыя або негатыўныя ўспаміны, ці даўно з'яўляюцца іх удзельнікамі.
- Потым папрасі ўсіх, каб яны сталі ў чаргу. Адна асоба выходзіць на сярэдзіну залі і гучна распавядае аб сваіх прыналежнасцях. Асобы, якаія таксама адчуваюць прыналежнасць да гэтай групы (могуць не мець яе запісанай на картках), падыходзяць да асобы, якая выказваецца. Могуць зрабіць толькі крок, могуць падысці вельмі блізка, гэта залежыць ад узроўню іх ідэнтыфікацыі.

**Абмяркоўванне і ацэнка**

- Запытайся, як яны сябе адчувалі падсчас практыкавання, што было лёгкім, а што прынесла цяжкасці, чаму? Ці знайшлі супольныя характарыстыкі з іншымі, ці не? Як сябе адчувалі ў цэнтры кола, а як на яго берагах?
- Патлумач удзельнікам, чым з'яўляецца першасная і другасная ідэнтыфікацыя.

**Парады для настаўнікаў**

Пасля практыкавання прапануй нейкую ціхую гульню

**КАВЯРНЯ SWOT**

Аб'ядноўвае ў сабе тэхніку world cafe[4] і аналізаванне SWOT[5]. Нефармальным чынам павялічвае заангажаванне групы ў дыскусію.

**Памер групы**: да 30 асобаў

**Час** 50 хвілін

**Мэты**

- развіццё навыку дыскусіі і стварэнне абагульненняў
- генералізацыя іннавацыйных меркаванняў, стварэнне ведаў у групе, супольныя веды

**Матэрыялы**

Фліпчарты/аркушы паперы, маркеры, матэрыялы да абсталявання кавярні (кветкі, напоі)

**Падрыхтаванне**

Падрыхтуй залю ў стылі кавярні- пастаў пяць 6-асабовых столікаў, пакладзі на іх фліпчары/ папяровы аркуш, маркер, ствары атмасферу кавярні (кветкі, напоі)

**Ход**

[4] Por. http://partycypacjaobywatelska.pl/technika/world-cafe/

[5] Por. http://pl.wikipedia.org/wiki/Analiza_SWOT

- Падрыхтуй разам з класай 5 становішч працы, якія адпавядаюць кожнаму этапу аналізу SWOT а) моцныя бакі, б) слабыя бакі, в) шансы, д) прынцыпы. На кожным становішчы працы павінны прысутнічаць пісьмовыя прыналежнасці. Папрасі групу, каб яна выбрала кожную 5 асобу сакратаром. Кожны з іх падчас практыкавання будзе сядзець каля іншага століку і матываваць ход дыскусіі. Рэшту класы падзялі на пяць 5-асабовых груп.
- Кожная група пачынае працу каля аднаго становішча. Потым па сыгнале настаўніка пераходзіць да наступнага і працягвае працу папярэдняй групы. Такім чынам ўсе групы працуюць над усімі 4 этапамі аналізу SWOT.
- Пасля сканчэння працы на ўсіх 5 становішчах папрасі сакратароў, каб яны прадставілі вынікі.

**Абмяркоўванне і ацэнка**

Робячы абагульненне, спытайся, ці нешта здзівіла вучняў, ці падчас прэзентацыі яны знайшлі штосьці новае, аб чым раней не думалі ў кантэксце дадзенага месца, праблемы?Як ім працавалася на кожным становішчы, што ўплывала на працу? Можаш папрасіць сакратароў аб дадатковых каментарах на тэму абсэрвацыі, якія паўсталі ў ходзе працы.

**КАРТКІ**

Стымулюючая гульня прадстаўляе наступствы адсутнасці правіл празрыстасці і эфектыўнасці мерапрыемстваў. Абуджае шмат эмоцый і паказвае пункт выйсця ад акрэслівання прынцыпаў наступства камунікацыі і дзейнасці, апартай на прынцып транспарацыі (пераходу).

**Памер групы** ад 15 асобаў

**Час** 45 хвілін

**Мэты**

- Усведамленне значэння празрыстасці прынцыпаў і іх знаёмасці для актыўнага ўдзельніцтва ў жыцці групы.
- Распазнаванне механізмаў, якія прытармажваюць актыўнасць.
- Акрэсліванне элементаў, якія матывуюць актыўны ўдзел.

**Матэрыялу**

каляровыя карткі, дошка або фліпчарт, пісьмовыя прыналежнасці, маркер

**Падрыхтоўка**

- Пастаў крэслы ў паўкола, 2 крэслы пастаў насупраць паўколу.
- Падрыхтуй карткі розных колераў. Могуць быць рознага памеру і формы.
- На картках падрыхтуй інструкцыі для жадаючых.
- Падрыхтуй шлях падзелу на падгрупы і выбару жадаючых.

**Ход**



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

- Папрасі групу, каб села паўколам. Паінфармуй вучняў/удзельнікаў, што хутка яны прымуць удзел у сымулюючай гульні. Сытуацыі, у якіх яны будуць удзельнічаць, не датычацца іх безпасярэдне, а будуць вынікаць з сытуацый, у якіх яны будуць знаходзіцца. Не ўсе сітуацыі будуць прыемнымі.
- .Скажы, што заданне будзе складацца з 4 частак і  для яго рэалізацыі патрэбныя 4 асобы, якія займуць месца насупраць паўкола і будуць дзейнічаць згодна з інструкцыямі.
- Выбар жадаючых.
- Частка першая : падай удзельнікам інструкцыі, каб яны давалі кожнай 3 асобе любую каляровую картку. Рэшце групы скажы, што заданнем кожнага з’яўляецца здабыча як мага большай колькасці картак.
- Частка другая: Падзялі групу на 5-7 асабовыя падгрупы. Скажы, што заданнем кожнай групы з’яўляецца здабыча як мага большай колькасці картак. Асобы ў групе могуць супольна ўсталёўваць стратэгіі дзейнасці. Жадаючыя раздаюць карткі кожнай 3 асобе.
- Частка трэцяя: Запрасі жадаючых параіцца. На некаторы час вы выходзіце з залі. Падай ім інструкцыю: пасля вяртання ў залю паінфармуйце групу, што вырашылі раздаць кожнаму па адной картцы таго ж самага колеру. Пасля вяртання жадаючыя выконваюць інструкцыю.
- Частка чацвертая: Запішы на дошцы/фліпчаце для кожнага колеру карткі іншую каштоўнасць. Папрасі групы, каб яны палічылі, якая з іх атрымала найбольшую колькасць картак. Вынікі запішы на дошцы/фліпчаце.
- Напрыканцы гульні скажы, што ўсе ўдзельнікі вельмі добра выканалі заданне; што ведаеш, што некаторыя сітуацыі былі вельмі цяжкімі, і менавіта таму цяпер ёсць час, каб абмеркаваць практыкаванне і эмоцыі, якія яно выклікала.
- Робячы абагульненне, запытайся ўдзельнікаў, як яны сябе адчувалі падчас выканання практыкавання і ў кожным з яго этапаў. Чаму так сябе адчувалі? Што іх матывавала да прыняцця рашэнняў, а што тармазіла іх актыўнасць, жаданне ўдзельнічаць? Якімі карысталіся стратэгіямі, каб атрымаць карткі? Звярні ўвагу на індывідуальную, групавую працу, ролю жадаючых. Запытайся, якія абшары рэчаіснасці закранала гэтае практыкаванне, якія механізмы выкарыстоўвала?
- Напрыканцы патлумач прынцып раздавання картак. Звярні ўвагу на значэнне эмоцый і матывацыі падчас прыняцця рашэнняў.

**Парады для настаўнікаў**

- За выкананнем практыкавання сочыць настаўнік/кіруючая асоба, якая пачынае і сканчвае кожны этап практыкавання, уводзячы наступныя прынцыпы.
- Практыкаванне ўзбуджае моцныя эмоцыі. Задбай аб пачуцці бяспекі і аб “упарадкаванню” эмоцый пасля практыкавання. Таксама можаш правесці кароткае практыкаванне “энерджайдзер” або фізічную  актыўнасць тыпу падскокаў.



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

- Заплануй наступнае практыкаванне. Яно павінна будаваць давер у групе, навыкі камунікацыі, удзельніцтва.
- Памятай пра розны досвед асобаў, якія стараліся атрымаць карткі ад жадаючых. У абагульняючай практыкаванне размове задбай, каб абодва бакі маглі выказацца, але без супрацьстаяння паміж сабой.
- Гэта не можа быць апошнім практыкаваннем на дадзены дзень, у дадзеным цыкле заняткаў.

**ПІРАМІДА**

Практыкаванне прадстаўляе сабой пераход ад індывідуальнага мыслення да групавога вырашэння. Ствараe магчымасць выказвання ўсіх удзельнікаў/вучняў. Пераход адбываецца ад малой дзейнасці (індывідуальная праца, праца ў малых групах) да вялікай (праца ў вялікіх групах, на форуме).

**Памер групы** ад 16 асобаў

**Час** 45 хвілін

**Мэты**

- Супольнае прыняццё рашэнняў, кансэнсусу.
- Развіццё навыку аргументацыі і кампрамісу.

**Матэрыялы**

- Малыя карткі, пісьмовыя прыналежнасці для кожнага ўдзельніка, дошка/фліпчарт, крэйда/маркер.

**Ход**

- Прадстаў вучням/удзельнікам тэму спаткання, а потым задай пытанні, над якімі яны будуць працаваць: напрыклад, якімі прынцыпамі з'яўляюцца прынцыпы эфектыўнай камунікацыі, што з'яўляецца найбольш вялікай пагрозай для markознага развіцця гораду, якія месцы вы б хацелі пабачыць падчас запланаванай экскурсіі?
- Папрасі вучняў, каб кожны індывідуальна напісаў на картцы 5 пароляў, якія будуць адказамі на дадзенае пытанне.
- Потым папрасі, каб асобы падзяліліся на пары і абмеркавалі свае адказы на пытанні і каб сярод выбраных 10 пароляў выбралі 5 найбольш адэкватных. Зазнач, што яны не могуць змяняць ніводнага слова ў арыгінальных паролях. Ад гэтага часу яны будуць супольна прэзентаваць гэты выбар.
- Папрасі, каб пары стварылі 4 асабовыя групы, узаемна запрэзентавалі вынікі гэтай працы і супольна выбралі 5 пароляў.
- Аб'яднуй наступныя групы такім чынам, каб стварыліся толькі 2 групы, якія будуць супольна акрэсліваць 5 пароляў.
- Запытайся аб ураджаннях ад працэсу стварэння супольнага меркавання, ці ўсе згаджаюцца з апошнім зробленым выбарам, ці лёгка было пакінуць свае першапачатковыя паролі?



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

- Абагульняючы, звярні ўвагу на значэнне аргументацыі пры супольным прыняцці рашэнняў і кансэнсусу.

**Парады для настаўнікаў**

- Можаш падрыхтаваць шлях дабірання пар і больш вялікіх групаў.
- Можаш падкрэсліць тое, ці ўсе вучні павінны запісваць на картках свае меркаванні ці толькі асобныя словы.
- Пастаўленыя ў практыкаванні пытанні мусяць мець некалькі магчымых варыянтаў адказу. Таксама варта падкрэсліць ці будуць з'яўляцца правільнымі адказамі кантраверсійныя адказы.

**Мадыфікацыя**

У моманце падзелу на 2 вялікія групы можаш правесці дэбаты паміж ўдзельнікамі двух бакоў.

- Пасля выбару 5 пароляў можаш прапанаваць пакласці іх ад самага істотнага да самага неістотнага з дапамогай дыскусіі, форуму або галасавання.

**АДЧЫНЕНАЯ ПРАСТОРА**

Адчыненая прастора (анг. Open Space) з'яўляецца методыкай арганізавання спатканняў і канферэнцый, часам яе яшчэ называюць "антыканферэнцыяй", дзякуючы свабоднаму характару працы і гісторыі яе стварэння. Яна сканчваецца планаваннем дзейнасці ў будучыні, за якую вучні нясуць адказнасць.

**Памер групы** ад некалькі асобаў да некалькі тысяч

**Час** Праца ў групе не павінна трываць даўжэй чым 1,5 гадзіны.

**Мэты**

- Разнабаковае абмеркаванне агульнай складанай праблемы.
- Пошук вырашэнняў, апарты на досведзе, ведах і навыках удзельнікаў.
- Запланаванне канкрэтных дзеянняў.
- Рэалізацыя вышэй названых мэтаў у кароткім акрэсе часу.
- Супольнае падзяленне адказнасці.

**Матэрыялы**

- План адчыненай прасторы, папера і пісьмовыя прыналежнасці на кожным становішчы працы, матэрыялы для прэзентацыі вынікаў працы над кожнай тэмай.

**Падрыхтоўка**

- Запланўй агульную тэму спаткання,. Задбай, каб гэта заангажоўвала удзельнікаў заняткаў. Падрыхтуй некалькі месцаў працы з паперай і пісьмовымі прыналежнасцямі.
- У бачным месцы павесь план "Адчыненай прасторы. " У гарызантальнай частцы табліцы ўпішы месцы, а ў вертыкальнай часовыя межы.

- Запланўй шлях і месца прэзентацыі вынікаў працы.

**Ход**

Пазнаём удзельнікаў з агульнай тэмай.

- Прадстаў назву методыкі як “Адчыненую Прастору”. Яна палягае на роўнай працы пры некалькіх становішчах над рознымі прынцыпамі. Кожны можа ў якім заўгодна момамце змяніць групу. Гэты прынцып называецца “правам двух стоп”-калі дадзеная асоба незадаволеная тэмай дыскусійнай групы, у якой яна знаходзіца, то яна павінна яе змяніць і перайсці да іншай. Удзельнікі дыскусійных групаў натуюць ход дыскусіі, а напрыканцы спаткання прэзентуюць на форуме яе вынікі. Мэтай дыскусіі з’яўляецца пошук вырашэнняў. Тэмы дыскусійных канкрэтных групаў і становішчаў працы прапаноўваць удзельнікі спаткання.

- Можаш распавесці гісторыю стварэння методыкі. Яна была створана ў 80-х гадах у выніку фрустрацыі, якую стварыў Гарысан Оўэн, калі заўважыў, што падчас старанна арганізацыі канферэнцыі, традыцыйныя сэсіі сканчваліся перапынкам на каву, менавіта падчас якога і адбываліся праўдзівыя дыскусіі. Уводзячы гэтую методыку “адчыненай прасторы”, хацеў выкарыстаць патэнцыял “перапынкаў на каву”, а тым самым павялічыць вынікі канферанцыйных спатканняў.

- Пакажы план “адчыненай прасторы”. Запрасі ўдзельнікаў запісаць свае тэмы ў выбраным вакне табліцы. У выніку, кожнай тэме будзе адпавядаць акрэслены час і месца дыскусіі.

**Першая мадыфікацыя**-Запрасі ўдзельнікаў да мазгавога шторму, мэтай якога будзе вырашэнне канкрэтных праблем у межах агульнай тэмы. Запішы ўсе прапановы на дошчы або фліпчаце. Потым у форме галасавання выбяры супольна акрэсленую лічбу тэмаў, над якімі будзеце працаваць. Упішыце іх ў план “Адчыненай Прасторы”.

- Папрасі, каб зацікаўленыя дадзенай тэмай асобы перайшлі да адпаведнага становішча працы. Прыгадай аб патрэбе натавання і прыгатавання рапарту.

- Праца ў дыскусійных групах праходзіць самастойна. Удзельнікі свабода перамяшчаюцца паміж становішчамі працы. Настаўнік сочыць за ходам дыскусіі і служыць інфарматарам.

- Пасля заканчэння дыскусіі запрасі ўсе групы да падрыхтоўкі рапарту, які будзе апісваць вынікі гэтай працы так, каб яны былі даступныя для асобаў па-за групай.

**Другая мадыфікацыя-** Можаш запрапанаваць іншы шлях прадстаўлення вынікаў дыскусіі, чым вусная прэзентацыя на форуме.

- Сканчваючы заняткі, запытайся, чаму ўдзельнікі навучыліся, працуючы з дадзенай методыкай.

- Робячы абагульненне, звяргі ўвагу на прапанову канкрэтных вырашэнняў. Калі гэта будзе магчымым, то абмяркуй план іх рэалізацыі.



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

**Парады для настаўнікаў**

- Методыка належыць да дыскусіі на шырокую і агульную тэму, якая заангажоўвае дадзеную групу. Тэма не можа быць абыякавай для ўдзельнікаў.

- Спраўджваецца на пытаннях з высокім узроўнем складанасці.

- Варта памятаць, што ў дыскусіях удзельнічалі асобы, якія мелі розныя кампетэнцыі, веды і перспектывы зразумення дадзенай праблемы.

- Адчыненасць структуры тэмаў спаткання павінна быць кампенсаваная дакладнасцю ў фармуліроўцы рэкамендацыі і прыняцця абавязкаў.

- Больш інфармацыі аб методыцы і шляхах яе выкарыстання знаходзіцца на старонцы OpenSpaceWorld.org.

## СУПОЛЬНЫЯ ПРЫНЦЫПЫ

Супольны збор прынцыпаў, якія павінны датычыцца як удзельнікаў так і асобаў, якія праводзяць заняткі. Звычайна яны ўсталёўваюцца на пачатку заняткаў.

**Памер групы** ад 2 асобаў

**Час** 15-30 хвілін

**Мэты**

- збудаванне бяспечнай прасторы
- аддаванне большай адказнаці за ход заняткаў у рукі вучняў
- усведамленне таго, што права з’яўляецца акрэсленым
- развіццё свядомасці ўласных праў
- развіццё навыкаў дыскусіі

**Матэрыялы** вялікі аркуш паперы, маркер

**Падрыхтоўка** падумай, якія прынцыпы адпавядаюць патрэбам дадзенай групы

**Ход**

- Папрасі ўдзельнікаў, каб яны падумалі, якія прынцыпы могуць уплываць на тое, каб яны адчувалі сябе бяспечна падчас воркшопаў і якія з прынцыпаў могуць аблегчыць супольную працу.
- Папрасі, каб яны запісалі іх на малых стыкерах і павесілі на вялікім аркушы паперы.
- Надай назву аркушу “Картка супольных прынцыпаў”.
- Пагрупіруй карткі па катэгорыях, прачытай іх і папрасі ўдзельнікаў, каб яны стварылі з іх прынцыпы. Праца адбываецца, выкарыстоўваючы методыку мазгавога шторму, а потым і дыскусіі. Выбраныя прынцыпы запісваюцца на аркушы.



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.

- Калі нейкія з прынцыпаў маюць негатыўную форму або забарону, то варта паспрабаваць змяніць іх форму (напрыклад, "Нікога не крыўдзячы"- "Звяртацца да ўсіх з шасункам")
- Абмяркуйце ўсе пункты. Калі яны неадназначныя, то дапішыце іх тлумачэнні.
- Задай пытанне, ці ўдзельнікі хацелі б яшчэ дадаць нейкія прынцыпы.
- Папрасі ўсіх, каб яны падпісаліся пад "Карткай супольных прынцыпаў".
- Павесь "картку" на бачным месцы.

**Абмяркоўванне і ацэнка**

- Задай пытанне, ці якія-небудзь прынцыпы здзівілі вучняў/ўдзельнікаў, ці з усімі прынцыпамі яны адразу пагадзіліся, якія з іх узбудзілі найбольш моцныя эмоцыі і супраціў.
- Запытайся, ці ведаюць яны іншыя наборы правілаў, ці прытрымліваюцца іх, чаму прытрымліваюцца або ламаюць іх.
- Звярні ўвагу на тое, што варта сабе ўсведаміць, якія прынцыпы былі б прыдатныя ў іншых сытуацыях па-за воркшопамі.

**Парады для настаўнікаў**

- У выпадку, калі да групы далучаюцца новыя асобы (як ўдзельнікі, так і кіраўнікі) папрасі групу, каб яна прадставіла прынцыпы і запыталася ў новых асобаў, ці яны згаджаюцца з імі, ці хочуць нешта дадаць.
- Памятай, што да "карткі супольных прынцыпаў" заўсёды можна дадаць наступныя прынцыпы або, карыстаючыся згодай цэлай групы, можна выкрэсліць тыя, якія прыносяць складанасці ў супольную працу.
- Памятай аб тым падчас наступных спатканняў з той самай групай.

**Іншыя тэхнікі партысыпацыі (ўдзелу)**

Асобы, якія цікавяцца тэхнікамі ўдзелу і працай з групай павінны наведаць сайт www.partycypacjaobywatelska.pl. У працы са школьнымі групамі можна між іншым прымяніць тэхнікі з абшару публічнай камунікацыі (паміж грамадзянамі і паміж грамадзянамі і ўладай) як Word Cafe, адчыненая прастора, Charette, сацыяльная кавярня, сацыяльны бюджэт.

**КРЫНІЦЫ**

-Карта падставовых правоў Эўразвязу, (2000/C 364/01).

- Рэалізацыя працоўнай праграмы Адукацыя і Навучанне2010 – Працоўная Група BKluczowe Kompetencje – Ключавыя кампетэнцыі ў навучанні праз цэлае жыццё:эўрапейскія межы стасавання. Эўрапейская Камісія, DG EIK, 10.2004.

- Рэкамендацыя Рады і Эўрапарламенту з 18 снежня 2006 наконт ключавых кампетэнцый у навучанні праз цэлае жыццё (2006/962/ЕС).
- Мернасць Грамадзянскіх Кампетенцый у Эўропе, Эўрапейкая камісія, Супольны Цэнтр Даследванняў, 2008
- Канклюзіі Рады ад 12 траўня 2009 адносна межаў стратэгіі эўрапейскай супрацы у галіне навучання і фарміравання ("ET 2020") (2009/C 302/03).

**Літэратура**

- H.Marshal, *Citizenship and Social Class*, Cambridge, 1950.
- J. Białas, I. Podsiadło-Dacewicz, M. Łojkowska, U. Małek, P. Skrzypczak, *Odkryj siłę praw człowieka*, Amnesty International, *Warszawa* , 2010.
- P. Brander, E. Keen, M.L. Lemineur, *Kompas. Edukacja o prawach człowieka w pracy z młodzieżą*, Centralny Ośrodek Doskonalenia Nauczycieli, Warszawa 2005; dostęp 7.10.2013: www.inni-rowni.pl/content/view/79/2.
- M. Brzozowska-Brywczyńska, *Partycypacja publiczna dzieci* [w:] *Decydujmy razem, (4)2013, dostęp: 7.10.2013, http://www.decydujmyrazem.pl/publikacje/decydujmy_razem_/partycypacja_publiczna_dzieci__ analizy_i_opinie_4.html.*
- *CIVICO - Rozwój kompetencji obywatelskich wśród uczniów. Przewodnik dla nauczycieli na temat nauczania kompetencji obywatelskich,* dostęp 7.10.2013: *www.civicoproject.eu/download/Guide_CIVICO_PL.pdf*
- D.Długosz, J.J. Wygnański, *Przewodnik po partycypacji społecznej*, Warszawa 2005.
- J.E. Doek J.E., *Citizen Child: a struggle for recognition, s. 2, dostęp 7.11.2013, http://www.jaapedoek.nl/publications/keynote.php.*
- *Edukacja obywatelska w Europie,* Eurydice, dostęp 7.10.2013: http://www.eurydice.org.pl/sites/eurydice.org.pl/files/citizen_PL.pdf
- H. Kirchner, *Janusz Korczak, pisarz-wychowawca-myśliciel, Instytut Badań Literackich, 1997.*
- A.Komorowska, *Dziecko w mieście. Udział dzieci i młodzieży w decydowaniu o przestrzeni miejskiej, kultura enter, dostęp 12.2008 http://www.kulturaenter.pl/0/05mo1.html.*
- *Kompas. Edukacja o prawach człowieka w pracy z młodzieżą, Głogów, 2004.*
- *Kompetencje Obywatelskie wersja 2.0*, Europejska Antena Szkoleniowa (EAS), 20, dostęp: 7.10.2013: www.vhs-passau.de/doctae/documents/Civic_competences_Description_PL.pdf.
- Konwencja o prawach dziecka, dostęp: 7.10.2013 http.www.unicef.org/magic/resources/CRC_polish_language_version.pdf
- Narodowy plan działań na rzecz dzieci 2004-2012 „Polska dla dzieci", Warszawa 2004, dostęp 6.11.2013 http://www.men.gov.pl/index.php?option=com_content&view=article&id=914.
- *Świat przyjazny dzieciom,* dostęp: 20.02.2013 http://www.unicef.org/specialsession/docs_new/documents/A-RES-S27-2E.

- *Świat przyjazny dzieciom to świat przyjazny wszystkim*, dostęp: 7.10.2013, http://www.unicef.pl/Co-robimy/Aktualnosci/SWIAT-PRZYJAZNY-DZIECIOM-TO-SWIAT-PRZYJAZNY-WSZYTSKIM
- *A World Fit For Children*, dostęp: 6.05.2013, http://www.case.edu/orgs/cwrumun/cwrumun.org/Chair.pdf
- P.O. Żylicz, *Obywatel dziecko. Raport z badań dzieci,* Warszawa 2009.

**СТАРОНКІ Ў ІНТЭРНЭЦЕ**

www.partycypacjaobywatelska.pl.

Апрацаванне: Эльжбета Окрой, Эва Окрой

*Публікацыя выказвае толькі погляды аўтара і не можа быць ідэнтыфікаваная з афіцыяльным становішчам Міністэрства Замежных Спраў Рэспублікі Польшчы.*



Праект дафінансаваны Дэпартамэнтам Публічнай і Культурнай Дыпляматыі Міністэрства Замежных Справаў у межах конкурсу Супольныя беларуска-польскія дзеяньні.